

# Кіраваць інфармацыяй

**Юлія Галкоўская,**

*дэкан, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

**Надзея Вайцяховіч,**

*загадчык кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Ва ўмовах імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій узрастае роля спецыялістаў, здольных эфектыўна кіраваць інфармацыяй, забяспечваючы ўзаемасувязь інфармацыйных рэсурсаў, людзей і тэхналогій. Бібліятэкі, музеі і іншыя інфармацыйна-культурныя цэнтры маюць патрэбу ў прафесіяналах, гатовых прымяняць міждысцыплінарны падыход у рабоце, спалучаючы фундаментальныя гуманітарныя веды і кампетэнцыі ў галіне бібліятэчнай і музейнай дзейнасці, інфармацыйных тэхналогій, камунікацый і сацыякультурных працэсаў. Падрыхтоўка такіх спецыялістаў з улікам патрэб рынку працы і сучасных лічбавых рэалій — асноўная задача **факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый** (ФІДК).







Гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў уласна і пачалася ў 1975 годзе з папярэдніка ФІДК — бібліятэчнага аддзела, створанага ў 1944-м у структуры Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. Сёння факультэт — гэта міждысцыплінарны адукацыйны і навуковы цэнтр, накіраваны на падрыхтоўку спецыялістаў у сферы бібліятэчна-інфармацыйнай і музейна-турыстычнай дзейнасці, кіравання інфармацыйнымі рэсурсамі, аналітыкі і інфармацыйных камунікацый. У склад факультэта ўваходзяць шэсць кафедр: беларускай і замеж-







най філалогіі, сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці, інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый, гісторыка-культурнай спадчыны, рускай мовы як замежнай.

Навучанне вядзецца па дзвюх асноўных спецыяльнасцях: «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» і «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Адукацыя ажыццяўляецца на некалькіх узроўнях: агульная вышэйшая і паглыбленая вышэйшая (магістратура), аспірантура.

Варта адзначыць, што ў 2024-м спецыяльнасць «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» была ўнесена ў пералік найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцей, што дае значныя перавагі абітурыентам пры паступленні ва ўніверсітэт на ўмовах навучання па мэтавым дагаворы.

Дае свой плён і цеснае ўзаемадзеянне факультэта з бібліятэкамі і музеямі як арганізацыямі — заказчыкамі кадраў на ўсіх этапах прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйнай і музейна-турыстычнай сферы. Нашы выпускнікі запатрабаваны ў бібліятэках і музеях краіны, інфармацыйных цэнтрах, архівах, выдавецтвах, турыстычных арганізацыях, органах дзяржаўнага кіравання і інш. Якасць падрыхтоўкі будучых спецыялістаў пацвярджаецца высокай іх запатрабаванасцю. У сярэднім штогод на аднаго выпускніка факультэта прыпадае 4 заяўкі на размеркаванне ад патэнцыйных працадаўцаў. Пры гэтым колькасць заявак на размеркаванне на аднаго выпускніка факультэта спецыяльнасці «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» расце: у 2019-м было 3,6 заяўкі, а ў 2025-м — 6,9. Па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» ў гэтым годзе колькасць заявак на аднаго выпускніка — 4,8.






Шматаспектнае супрацоўніцтва з вядучымі бібліятэкамі і музеямі краіны садзейнічае фарміраванню актуаль-







нага зместу адукацыі, падрыхтоўцы кампетэнтных маладых спецыялістаў, якія валодаюць сучаснымі прафесійнымі ведамі і ўменнямі, стварэнню ўмоў для прафесійнай адаптацыі выпускнікоў спецыяльнасці і іх паспяховага замацавання на працоўных месцах.

Адметнай рысай сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі, якая рэалізуецца на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый, з'яўляецца пабудова адукацыйнага працэсу з улікам запытаў рынку працы, а таксама змястоўных патрабаванняў да ведаў і ўменняў выпускнікоў з боку працадаўцаў. Гэта абумоўлівае супрацоўніцтва з вядучымі бібліятэкамі краіны па розных напрамках:

— вучэбна-метадычная дзейнасць (абнаўленне зместу адукацыі, узгадненне вучэбных планаў, рэцэнзаванне вучэбных праграм, правядзенне практыка-арыентаваных семінараў на пляцоўках бібліятэк для выкладчыкаў і інш.);

— адукацыйная дзейнасць (рэалізацыя ўсіх відаў практыкі: навучальнай, вытворчай); правядзенне навучальных заняткаў на базе бібліятэк па навучальных дысцыплінах;

— сацыяльна-культурная дзейнасць (арганізацыя ў партнёрстве «бібліятэка — факультэт» праектаў культурнага, выхаваўчага характару);

— працаўладкаванне студэнтаў і выпускнікоў;

— дзейнасць па суправаджэнні прафесійнай адаптацыі выпускнікоў;

— навуковая дзейнасць (арганізацыя і правядзенне навуковых, навукова-практычных канферэнцый, семінараў у партнёрстве з бібліятэкамі, правядзенне сумесных навуковых даследаванняў па праблемах бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі і практычнай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці).

На сёння БДУКМ мае ў наяўнасці 12 дагавораў з музеямі і 23 дагаворы з бібліятэкамі і бібліятэчнымі сістэмамі аб узаемадзеянні ўстановы адукацыі



з арганізацыяй — заказчыкам кадраў. Гэта спрыяе якаснай падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў з улікам патрэб базавай арганізацыі.

Філіялы кафедр гісторыка-культурнай спадчыны і інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый адкрыты на базе Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь адпаведна. Гэта дазваляе праводзіць на іх пляцоўках навучальныя заняткі і мерапрыемствы, арганізоўваць сумесныя навуковыя даследаванні і сацыякультурныя праекты.

Адукацыйная мадэль ФІДК акцэнтуе практыка-арыентаваны падыход, прымяненне тэхналогій праектнага, кантэкстнага, праблемнага навучання, інтэрактыўных і гульнявых метадаў; укараненне лічбавых адукацыйных тэхналогій; сістэмную індывідуалізацыю адукацыйнага працэсу.

Падрыхтоўка будучых спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай і музейна-турыстычнай сферы прадугледжвае стымуляванне студэнтаў на стварэнне ўласных сацыяльна-культурных праектаў, фарміраванне ўменняў у галіне валодання вобразнымі і выразнымі сродкамі генерыравання і дэманстрацыі сваіх ідэй. На факультэце практыкуюцца творчыя заданні студэнтам. Напрыклад, стварэнне буктрэйлераў — прамаролікаў літаратурнага тэксту — прэзентацыя кніг у свабоднай мастацкай форме пры дапамозе аўдыявізуальных сродкаў, падрыхтоўка і правядзенне гарадскіх тэматычных і відэаэкскурсій, сацыяльна-культурных праектаў рознай накіраванасці.

З кастрычніка 2001 года на факультэце дзейнічае літаратурна-творчае аб'яднанне «БУКет», якое займаецца выяўленнем і раскрыццём талентаў, пошукам новых форм літаратурнай работы з удзелам прадстаўнікоў іншых творчых аб'яднанняў і вядомых беларускіх пісьменнікаў, чальцоў Саюза пісьменнікаў Беларусі ў якасці кансультантаў і крытыкаў. Ініцыятары і актыўныя арганізатары пасяджэнняў і сустрэч — кафедра беларускай і замежнай філалогіі. Вынікам працы аб'яднання сталі літаратурна-мастацкія зборнікі твораў студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта: «Акварэлі», «Шторм кропель», «Каліва», «Кветка ў мегаполісе», «Дар зямны», «Вёска», «Светлыя словы», «Віншуем, Натхненне!», «Я жыву», «Апошні дзень лета...» і інш.

Выкладчыкі факультэта — вядучыя беларускія вучоныя і практыкі ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кніжнай культуры, гісторыі і музеязнаўства, беларускай і замежнай філалогіі, сацыялогіі, філасофіі і іншых сацыяльных і гуманітарных навук. Для выкладання дысцыплін запрашаюцца вядучыя вучоныя і спецыялісты з Расійскай Федэрацыі. Акадэмічным кантактам у адукацыйным асяроддзі адводзіцца асаблівая роля. Факультэт мае глыбокія традыцыі зносін паміж выкладчыкамі і студэнтамі, заснаваныя на ўзаемным даверы, павазе, імкненні да сумеснага развіцця. Такое ўзаемадзеянне дазваляе ўдзельнікам адукацыйнага працэсу асэнсоўваць агульнасць мэт і сродкаў навучання для асваення вучэбных дысцыплін, выканання канкрэтных заданняў і ў далейшым садзейнічае камфортнаму ўваходжанню выпускнікоў факультэта ў выбраную прафесію. Прастора навучання і прафесійных зносін пашыраецца дзякуючы студэнцкім акадэмічным абменам, якія цяпер арганізуюцца з бібліятэчна-інфармацыйным факультэтам Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага інстытута культуры, бібліятэчна-інфармацыйным факультэтам Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры.

Вялікая ўвага надаецца навукова-даследчай рабоце студэнтаў і магістрантаў. У супрацоўніцтве з выкладчыкамі маладыя вучоныя рыхтуюць выступленні з дакладамі на шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, публікацыі ў навуковыя зборнікі. Даследаванні студэнтаў кафедры заўсёды годна прадстаўляюцца на Рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых прац. На






факультэце навучаюцца стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, уладальнікі стыпендый імя Ф. Скарыны, П. Броўкі, Савета ўніверсітэта.

Навукова-даследчая дзейнасць на факультэце ўключае рэалізацыю навуковых праектаў, у тым ліку па заказе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, распрацоўку комплексных навуковых тэм у адпаведнасці з даследчымі і прафесійнымі інтарэсамі прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта, а таксама выкананне дысертацыйных даследаванняў.






Супрацоўнікі факультэта актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце і па гэтым паказчыку займаюць адно з вядучых месцаў ва ўніверсітэце. Сярод найбольш значных навуковых напрамкаў, якія распрацоўваюцца кафедрамі ФІДК, тэзаўрус культуры: нематэрыяльная і матэрыяльная гісторыка-культурная спадчына Рэспублікі Беларусь; бібліятэка як элемент лічбавай экасістэмы; бібліятэка як сацыякультурны інстытут: сучасны стан і стратэгіі развіцця; сістэма гуманітарных ведаў як тэарэтычная і светапоглядная аснова падрыхтоўкі спецыялістаў галіны культуры і інш.

Геаграфія навуковых камунікацый выкладчыкаў кафедраў уключае установы культуры, навуковыя і адукацыйныя ўстановы Беларусі, Расіі, Славакіі, Балгарыі.

Асноўнымі цэнтрамі навуковага супрацоўніцтва сталі такія ўстановы, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны інстытут культуры, Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры, Арлоўскі дзяржаўны інстытут культуры, Казанскі дзяржаўны інстытут культуры, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў і інш.

У 2020—2023 гадах быў выкананы шэраг даследчых праектаў у рамках Плана навуковых даследаванняў і распрацовак агульнадзяржаўнага, галіновага прызначэння, накіраваных на навукова-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Сярод іх навуковыя работы «Даследаваць тэндэнцыі і шляхі развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі ў век лічбавых тэхналогій», «Прафесійная адаптацыя выпускнікоў спецыяльнасці «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» ва ўмовах узаемадзеяння ўстановы вышэйшай адукацыі і працадаўцаў», «Фарміраванне навуковай школы Беларусі ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства: гісторыя і персаналіі».

За апошнія пяць гадоў на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» былі абаронены чатыры дысертацыі выпускнікамі факультэта. На саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі па спецыяльнасці «Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў» — пяць кандыдацкіх дысертацый.

Адукацыйная і навуковая дзейнасць факультэта спрыяе развіццю ключавых напрамкаў беларускай навукі і культуры, прапаноўваючы інавацыйныя падыходы да бібліятэчна-інфармацыйнай і музейнай дзейнасці, выхоўваючы пакаленне прафесіяналаў, гатовых эфектыўна працаваць у эпоху лічбавай трансфармацыі. У сучасных умовах факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый выконвае важную сацыяльную місію, накіраваную на ўмацаванне культурнага і інтэлектуальнага патэнцыялу краіны, развіццё інфармацыйнай інфраструктуры, захаванне і памнажэнне культурнай спадчыны.